Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Ананіцкі навучальна – педагагічны
комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа”

**Тэма ўрока:** Сказы з аднароднымі членамі

# ***«Пакуль жыве мова, жыве народ…»***

**Прадмет:** беларуская мова
**Клас:** 4

Падрыхтавала:
настаўнік пачатковых класаў
Дабрыцкая А.М.

аг.Сітнікі, 2021

**Тэма:** Сказы з аднароднымі членамі
***«Пакуль жыве мова, жыве народ»***
Мэта:
- адпрацоўваць уменне знаходзіць у сказах аднародныя члены, вызначаць іх сінтаксічную функцыю, будаваць сказы з аднароднымі членамі, правільна інтанаваць іх;
- выпрацоўваць пунктуацыйныя навыкі;
- замацоўваць і паглыбляць веды аб родным краі: прыроды, працы, культуры, народнай творчасці;
- выхоўваць пачуццё гонару за сваю рэспубліку, за беларускую мову, свой народ.
Абсталяванне: карткі; лісткі дрэў для групавой работы; заданні для парнай і індывідуальнай работы.

Ход урока

**1. Арганізацыйны момант**
Празвінеў званок, пачынаецца ўрок.
Вочкі вашы бачаць, вушкі чуюць,
Ножкі сябруюць, а ручкі працуюць.
(звяртаецца ўвага на пасадку вучняў.)
- Я жадаю вам, каб урок прайшоў паспяхова і ў добрым настроі.
- Наш урок пройдзе пад назвай «Пакуль жыве мова, жыве народ». Сімвалам нашага ўрока будзе кветка валошка (малюнак на дошцы).
- Сёння на ўроку мы прадоўжым працу над тэмай "Аднародныя члены сказа", будзем вучыцца знаходзіць аднародныя члены у сказах, правільна інтанаваць іх.
- Як вы думаеце, чаму я прапаную менавіта такую назву ўрока?
- Аб чым сёння пойдзе гаворка на ўроку?

**2. Моўная размінка**
(2 слупкі запісаны на дошцы, астатнія чытае настаўнік)

**Таццяна Маладцова**

**Родная мова, бацькава мова**

*Родная мова, бацькава мова*
*Самая мне родная,*
*Самая прыгожая,*
*Мілая, цудоўная!*

*Трэба мову паважаць,*
*Бараніць яе,*
*Каб ніхто не мог зламаць*
*Слова беларускае!*

*Забываюць ўсе цябе,*
*Мовачка радзімая,*
*Ты адна ў маім жыцці,*
*Вера ты адзіная!*

*Радзіма...Мова...Маці..*

*Як прыемна гэта чуць!*
*Я гатова ўсе аддаць ім,*
*Каб аддаць - і не звярнуць!*

*Так жыві ж ты вечна,*
*Мовачка радзімая,*
*Самая мне родная,*
*Самая мне мілая!!!*

*1.Чытанне шэптам, з радасцю, з гонарам.*
*2.Назавіце слова, ужытыя ў пераносным значэнні.*
*3.Растлумачце сэнс "бацькава мова".*
*4. Якія сказы па мэце выказвання і інтанацыі?*
*5. Назавіце аднародныя члены сказа.*

**3. Чыстапісанне**
**Бб ел арус Кая МО ва**
-Якія словы схавалася ў гэтых літарах? (беларуская мова).
- Давайце складзём сказ пра нашу мову, каб у ім былі ужыты аднародныя члены сказа і запішам яго. (вучань піша на дошцы)
*Заданне:* падкрэсліце галоўныя члены, вусна назавіце словазлучэнні; зрабіце схему, назавіце аднародныя члены. Аднароднымі бываюць …. (дзейнікі, выказнікі, даданыя члены). Давайце яшчэ разам прачытаем, што такое аднародныя члены сказа на ст.45
- А зараз пагуляем з вамі ў хованкі. Якія літары схаваліся ў слоўнікавых словах? (слоўнікавыя словы на лісточках з прапушчанымі літарамі). Дзеці аб'ядноўваюцца ў групы па колеру лісцікаў.
**4. Замацаванне**
***А) Заданні на картачках***. Запісаць у сшытак.
1 група – Дапоўніць сказ аднароднымі членамі сказа. Падкрэслі дзейнік і выказнік.
*Наш беларускі народ (які?)……,…….,…….,……. .*
2 група – Паставіць знакі прыпынку ў сказе, падкрэсліць аднародныя члены сказа.
*Наша краіна Беларусь сінявокая незалежная мірная шчаслівая.*
3 група – Нарысуй схему да сказа. Устаў знакі прыпынку, падкрэслі аднародныя члены сказа.
*Беларуская мова гучная пявучая меладычная.*

**ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКА**
Устаньце, дзеткі, усміхніцеся,
Зямлі нашай беларускай пакланіцеся
За шчаслівы дзень учарашні.
Усе да сонца пацягніцеся,
Улева, управа нахіліцеся,
Верацёнцам пакруціцеся.
Раз прысядзьце, два прысядзьце
І за парты усе прысядзьце.

***Б) Праца над тэкстам*** (тэкст запісаны на картках)

*На роднай мове пісьменнікі напісалі шмат вершаў, песень, казак, паданняў. Але хочацца, каб часцей гучала наша мова! Беларусы ганарацца мовай, берагуць яе і шануюць.*

**Заданні да тэксту:**

Спісаць тэкст, падкрэсліць аднародныя члены. Растумачыць, як разумеюць сэнс сказа "*Беларусы ганарацца мовай, берагуць яе і шануюць".*

***В) Работа з прыказкамі пра мову і Радзіму*** (вучні па чарзе выходзяць да дошкі, бяруць з "Чароўнага куфэрка" пагаворкі, чытаюць і тлумачаць іх сэнс)

Усяму пачатак — родная мова.
Хто забыў сваіх продкаў — сябе губляе, хто забыў сваю мову — усё згубіў.
Родная зямелька – як зморанаму пасцелька.
На чужыне і камар загіне.
Чым за морам віно піць, лепш з Нёмана вадзіцу.
У сваім краі, як у раі.

***Г) Праца з падручнікам***

Самастойнае выкананне Пр. 77, с. 52 – 53 (некалькі сшыткаў на праверку)

**5. Падвядзенне вынікаў урока .**

**Дамашняе заданне. С. 53 пр.79 ?**

Рэфлексія

Дзеці падыходяць па чарзе да валошкі, якая знаходзіцца на дошцы, бяруць адзін пялёстак ,чытаюць сказ і прадаўжаюць выказванне:

Я даведаўся …
Я навучыўся…
Мне было цяжка …
Мне спадабалася …
Я запомніў, што…..
Я буду заўжды……

- Мне пашчасціла сёння працаваць з такімі тэленавітымі і зацікаўленымі вучнямі, якія імкнуцца размаўляць на роднай мове і з павагай ставяцца да яе.

І на паследак я вам жадаю: любіце нашу Радзіму, ганарыцеся ёю, каб кожны з вас годны быў сказаць: "Люблю цябе, родная мова, люблю цябе, мая Беларусь!"

Хачу падарыць вам на памяць валошкі, на якіх напісаны словы пра нашу родную беларускую мову.

1 група. Дапоўніць сказ аднароднымі членамі сказа. Падкрэслі дзейнік і выказнік.

**Наш беларускі народ** (які?) **…….., ……., ……   .**

2 група. Паставіць знакі прыпынку ў сказе, падкрэсліць аднародныя члены сказа.

**Наша краіна Беларусь сінявокая  незалежная мірная**

3 група.  Нарысуй схему да сказа. Устаў знакі прыпынку, падкрэслі аднародныя члены сказа.

**Беларуская мова гучная пявучая меладычная**

На роднай мове пісьменнікі напісалі шмат вершаў, песень, казак, паданняў. Але хочацца, каб часцей гучала наша мова! Беларусы ганарацца мовай, берагуць яе і шануюць.

На роднай мове пісьменнікі напісалі шмат вершаў, песень, казак, паданняў. Але хочацца, каб часцей гучала наша мова! Беларусы ганарацца мовай, берагуць яе і шануюць.

На роднай мове пісьменнікі напісалі шмат вершаў, песень, казак, паданняў. Але хочацца, каб часцей гучала наша мова! Беларусы ганарацца мовай, берагуць яе і шануюць.

На роднай мове пісьменнікі напісалі шмат вершаў, песень, казак, паданняў. Але хочацца, каб часцей гучала наша мова! Беларусы ганарацца мовай, берагуць яе і шануюць.

На роднай мове пісьменнікі напісалі шмат вершаў, песень, казак, паданняў. Але хочацца, каб часцей гучала наша мова! Беларусы ганарацца мовай, берагуць яе і шануюць.

На роднай мове пісьменнікі напісалі шмат вершаў, песень, казак, паданняў. Але хочацца, каб часцей гучала наша мова! Беларусы ганарацца мовай, берагуць яе і шануюць.

Усяму пачатак — родная мова.

Хто забыў сваіх продкаў — сябе губляе, хто забыў сваю мову — усё згубіў.

Родная зямелька – як зморанаму пасцелька.

На чужыне і камар загіне.

Чым за морам віно піць, лепш з Нёмана вадзіцу.

У сваім краі, як у раі.

**Я - беларус, і я шчаслівы,**

**Што маці мову мне дала,**

**Што родных песень пералівы**

**І зблізку чую, і здаля.**

**Н. Гілевіч**

**Я - беларус, і я шчаслівы,**

**Што маці мову мне дала,**

**Што родных песень пералівы**

**І зблізку чую, і здаля. (Н. Гілевіч)**

**Я - беларус, і я шчаслівы,**

**Што маці мову мне дала,**

**Што родных песень пералівы**

**І зблізку чую, і здаля. (Н. Гілевіч)**

**Я даведаўся …**

**Я навучыўся…**

**Мне было цяжка …**

**Мне спадабалася …**

**Я запомніў, што…..**

**Я буду заўжды……**

